

Серыя нотных выданняў "Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі", заснаваная ў 2008 годзе, выходзіць у Мінску пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі, БДУ культуры і мастацтваў, Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі ды аддзела культуры Генеральнага консульства Рэспублікі Польшча ў Санкт-Пецярбургу. Аўтар і кіраўнік праекта — дацэнт БДУКіМ Яўген Паплаўскі. Нядаўна выйшаў ужо IV выпуск гэтай серыі: "Характарыстычныя п'есы" для фартэпіяна — зборнік твораў Антона Абрамовіча. У 2010 г. адзначаецца 200-годдзе з дня нараджэння гэтага кампазітара, які нарадзіўся на Віцебшчыне ў сям'і збяднелага шляхціца-музыканта і пасля 1932 г. з'ехаў у Пецярбург, але падтрымліваў сувязь з беларускай культурай і мовай праз уласную творчасць. Будучаму юбілею і прысвечаны новы нотадрук, рэкамендаваны адпаведнымі структурамі Рэспубліканскага каледжа пры БДАМ і БДУКіМ да выдання як вучэбна-метадычны дапаможнік. Укладальнік і аўтар уступнага артыкула Яўген Паплаўскі знайшоў гэтыя творы ў сховішчах РНБ у С.-Пецярбургу: у цыкл "Шэсць характарыстычных п'ес" уваходзяць мініяцюры "Адвага", "Таямнічасць", "Рамантызм", "Ажыўленне", "Меланхолія", "Весялосць", апроч іх у зборніку — "Галоп" і разгорнуты, складаны тэхнічна, "Вальс". Музычную рэдакцыю нотных тэкстаў зрабіў выкладчык каледжа — вядомы музыкант-выканаўца і педагог Аляксандр Мільто.

**Лана ІВАНОВА**

***На здымках: сцэна з балета "Ціль Уленшпігель"; вокладка зборніка п'ес А. Абрамовіча.***

***Фота Васіля Майсяёнка і аўтара***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ